# ДАКУМЕНТАЛЬНЫ СКЛАДНІК У РАМАНАХ СЯРГЕЯ ЛЕСКЕЦЯ «ШЭПТ» І АЛЕНЫ САБУХАВАЙ «ШАПТУХІ»: КАМПАРАТЫЎНЫ АСПЕКТ

**К. В. Кавалеўская**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4,*
*220030, г. Мінск, Беларусь, merle013582@gmail.com*
*Навуковы кіраўнік – А. У. Вострыкава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

У рабоце аналізуецца ў кампаратыўным аспекце дакументальны складнік раманаў сучаснай славацкай пісьменніцы Алены Сабухавай «Шаптухі» і сучаснага беларускага пісьменніка Сяргея Лескеця «Шэпт». Даецца характарыстыка вобразаў, кампазіцыйных адметнасцяў названых твораў. Разглядаецца роля фотаздымкаў у мастацкай тканіне тэкстаў. Выяўляецца месца аўтарскага пачатку і спосабы яго рэпрэзентацыі ў творах пісьменнікаў.

***Ключавыя словы:*** сучасная славацкая літаратура; творчасць А. Сабухавай; сучасная беларуская літаратура; творчасць С. Лескеця; дакументальны раман; феномен «шаптання»; фотаздымкі як ідэйны і кампазіцыйны элемент твораў.

# ДОКУМЕНТАЛЬНАЯ СОСТАВЛЯЮЩАЯ В РОМАНАХ СЕРГЕЯ ЛЕСКЕТЯ «ШЭПТ» И АЛЕНЫ САБУХОВОЙ «ŠEPTUCHY»: СРАВНИТЕЛЬНЫЙ АСПЕКТ

**Е. В. Ковалевская**

*Белорусский государственный университет, пр-т Независимости, 4,*
*220030, г. Минск, Беларусь, merle013582@gmail.com*
*Научный руководитель – Е. В. Вострикова, кандидат филологических наук, доцент*

В статье в сравнительном аспекте анализируется документальная составляющая романов современной словацкой писательницы Алены Сабуховой «Šeptuchy» («Шептухи») и современного белорусского писателя Сергея Лескетя «Шэпт» («Шепот»). Дается описание образов, композиционных особенностей данных произведений. Рассматривается роль фотографий в художественной ткани текстов. Обнаруживается место авторского начала и способы его репрезентации в творчестве писателей.

***Ключевые слова:*** современная словацкая литература; творчество А. Сабуховой; современная белорусская литература; творчество С. Лескетя; документальный роман; феномен «шептания»; фотографии как идейно-композиционный элемент произведений.

На сённяшні дзень у літаратуразнаўстве сустракаюцца розныя вызначэнні жанраў твораў, напісаных у рэчышчы мастацка-

дакументальнай літаратуры. «Да жанраў дакументальнай прозы адносяцца дзённікі, лісты, мемуары, успаміны і аўтабіяграфіі. Мастацка-дакументальная проза – гэта не механічнае, фармальнае злучэнне дакумента і мастацкіх спосабаў пісьма, а складанае, шматпавярховае ўзаемадзеянне супрацьлеглых магчымасцяў адлюстравання жыццёвага працэсу» [1, с. 8].

Жанр твора Сяргея Лескеця «Шэпт» мы вызначаем як дакументальны раман. Устаноўка на дакументальнасць – першапачатковае імкненне аўтара адарвацца ад мастацкага вымыслу. Аўтар дэманструе, што гэта не фантазія, і тым самым вонкава парадаксальным чынам адмаўляецца ад праўдападабенства – ён павінен быць праўдзівым, а не праўдападобным, нават калі праўда неверагодная.

Мастацкі складнік у рамане Сяргея Лескеця не аддзяляецца ад дакументальнага, а неразрыўна пераплятаецца з ім, што стварае асаблівую форму твора: тэкст набывае большую цэласнасць і пазбаўляецца першапачатковай навуковасці. Мастацкія апісанні знешнасці інфармантак, перажыванняў і пачуццяў аўтара як галоўнага героя, усведамленне і пераасэнсаванне гераінь зліваюцца, не адасабліваюцца ад факталагічнага матэрыялу. Аповед лаканічны, межы паміж мастацкім і дакументальным складнікамі сціраюцца. Біяграфічныя звесткі інфарматак могуць быць пададзены як у дыялогавай форме, так і ўводзіцца аўтарам.

Галоўнае слова С. Лескець пакідае за чытачом, ён амаль самаўхіляецца, даючы чытачу самому раскрыць сэнс пададзеных фактаў. Выдумка ў творы зводзіцца да мінімуму, альбо яе наогул няма. У рамане адбываецца раскрыццё феномену «шаптання», які знаходзіцца пад пагрозай знікнення, як важнай гістарычнай і этнаграфічнай з'явы, фальклорнага складніка славянскай ментальнасці.

Жанравай спецыфіцы рамана С. Лескеця ўласціва наяўнасць вялікай колькасці сведкаў, кожны з якіх выкладае ўласны пункт гледжання, успаміны, агляд асабістых практык, стаўленне да іх. Аповед вядзецца ад першай асобы, будуецца па прынцыпе «свет вакол мяне», паводле якога апавядальнік займае ўнутраную пазіцыю ў адносінах да апісаных падзей. Прысутнасць у тэксце мноства аўтаномных чалавечых свядомасцяў не прадугледжвае супрацьборства і сутыкненні іх пазіцый. Задача аўтара складаецца ў тым, каб вывесці як агульныя рысы феномена «шаптання», так і яго адрозненні, абумоўленыя тэрытарыяльнай разнастайнасцю, асабістымі якасцямі носьбітак, паходжаннем іх уласнага «дару» і г. д.

Твор мае асаблівую кампазіцыю, пры гэтым адзінай і галоўнай крыніцай інфармацыі застаюцца сведчанні «жанчын-шаптух», якія аб'ядноўваюцца аўтарам у структурна арганізаванае адзінства. Вонкавая

фрагментарнасць тэксту прадугледжвае ўнутраныя сэнсавыя сувязі, дзякуючы якім у свядомасці чытачоў фарміруецца цэласная карціна.

Творчая воля пісьменніка адчуваецца і ў размяшчэнні фактычнага матэрыялу, а гэта значыць і ў кампазіцыйнай арганізацыі твора. У рамане С. Лескеця часткі і падзагалоўкі называюцца па імёнах ці прозвішчах апытаных жанчын: Макарыха, Яніна Снежка, Бабка Стася, Ядзя, Боўкель, Замара, Ева, Бабка Надзея, Фядора, Юзэфа, Станіслава, Зоя, Надзя, Юля, Баба Каця, Алена, Ульяна [2], альбо ў якасці загалоўкаў выступаюць цытаты з іх аповедаў: «Я вашыя богі знаю» [2, с.112], «Царыца етого» [2, с. 135]. Калі-нікалі ў якасці назвы структурнага раздзелу рамана выкарыстоўваецца назва населенага пункта: Крывулі, Гудагай, Гальшаны-Глыбокае, Міжрэчча, Данілегі, што адначасова дадае канкрэтыкі і дакументальнай дакладнасці.

Амерыканская даследчыца А. Бёгер зазначае, што скарыстанне фатаграфіі як часткі мастацкага поля (напрыклад, у газеце ці часопісе) узмацняе «эфект рэальнасці» (reality effect), злучае два спосабы асэнсавання рэчаіснасці і ўяўлення «канкрэтнай рэальнасці» (concrete reality) у адзіным інтэрмедыяльным артэфакце [3, с. 175]. У сучасным рамане, на думку В. Судленкавай, фатаграфія «дае аўтарам магчымасць новых формаў арганізацыі літаратурнага тэксту, нетрадыцыйных метадаў пабудовы сюжэту і стварэння вобразаў, а таксама пастаноўкі такіх надзённых агульнаэстэтычных пытанняў, як праблемы праўдзівасці намаляванага, суб’ектыўнасці і аб’ектыўнасці інтэрпрэтацыі гісторыі ў мастацтве, суадносінаў візуальных і слоўных вобразаў і г. д.» [4, с. 98].

Славацкая пісьменніца Алена Сабухава са сваім спадарожнікам і фатографам Робам Тапертам вывучала Падляшскі свет. Мастакі адкрывалі Падляшша не толькі з боку фальклорнай і міфічнай спадчыны, але і з боку мастацтва фатаграфіі. Фотаздымкі з выявамі пейзажаў, жыхароў, рэчаў, абрадаў складаюць эстэтыку Падляшша, якая становіцца экспазіцыяй да рамана «Шаптухі» («Šeptuchy»). Кожны фотаздымак, размешчаны перад тэкстам яе твора, суадносіцца з пэўнымі сюжэтнымі момантамі і з’явамі, што злучае два спосабы ўспрыняцця прадстаўленай рэальнасці.

Так, напрыклад, на двух фотаздымках Роб Таперт зафіксаваў туман, які расцілаецца над лесам [5, с. 21] і над ракой [5, с. 13]. У рамане славацкай аўтаркі туману як з’яве надаецца асаблівая ўвага. Туман з’ўляецца складнікам мастацкай прасторы твора: «Туманы на Падляшшы ў парадку дня. Ім пачынаюцца і заканчваюцца дні, часам праз іх не бачна і некалькі метраў перад сабой» [5, с. 36]; часткай рытуалу: «…людзі сустракалі святых і грэшнікаў, таемна хадзілі ў тумане чакаць сваіх блізкіх, якія часам не прыходзілі» [5, с. 39], «Дарота казала не

азірацца ў тумане, таму што я іх пабачу». Адначасова туман становіцца пэўнай міфалагемай у рамане: «Гасподзь спачатку стварыў туман, потым для яго прыдумаў Падляшша, а ўрэшце і ўвесь астатні свет» [5, с. 36]. На іншым фотаздымку [5, с. 16] Робам Тапертам была адлюстравана постаць жанчыны са спіны, на якой ляжала доўгая сівая каса. Валасы ў рамане фігуруюць у якасці як партрэтнага элемента, так і часткі абраду.

Аб'яднанне фотаздымкаў і літаратуры ўзмацняе «эфект рэальнасці», злучае розныя спосабы рэпрэзентацыі ў адзін, што ўплывае на ўспрыманне не толькі ідэі твора, але і спосабу яго мастацкай арганізацыі.

У адрозненні ад Алены Сабухавай, фотаздымкі якой становяцца амаль прадмовай да рамана, Сяргей Лескець інтэгруе выявы інтэрв'юераў у тэкст, робіць іх яго часткай пры дапамозе апісання працэсаў фатаграфавання і друкавання. У рамане «Шэпт» фотаздымкі выступаюць не толькі ў ролі партрэтаў гераінь, але і ў якасці дакументаў. Фатаграфіі шаптух сцвярджаюць іх прысутнасць у рэальнасці, занатоўваюць іх існаванне, пераносяць гераінь у катэгорыю існага, а не толькі вобраза рамана, адначасова з гэтым надаюць пачуццё прысутнасці «ўнутры» падзей, у моманце, і самому чытачу.

Такім чынам, кампазіцыйнымі асаблівасцямі абодвух раманаў выступаюць фотаздымкі, майстарскі інтэграваныя ў тэкст. Фатаграфіі дапамагаюць аўтарам асвоіць новую форму арганізацыі тэксту. Сюжэт рамана Сяргея Лескеця «Шэпт» пабудаваны нетрадыцыйна, важнымі элементамі і аб'ектамі падзей з'яўляюцца менавіта фатаграфіі, размешчаныя аўтарам ў творы. Калі ў Сяргея Лескеця фотаздымкі – гэта як дакументальна-мастацкі складнік рамана, так і сюжэтны, то ў Алены Сабухавай фотаздымкі выступаюць у якасці дадатковага мастацкага элемента, якія толькі дапамагаюць чытачу пагрузіцца ў твор.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Симонова Т. Г.* Мемуарная проза русских писателей XX века: поэтика и типология жанра : учеб. пособие. Гродно : ГрГУ, 2002.

2. *Лескець С.* Шэпт. Мінск : Энцыклапедыкс, 2023.

3. *Böger A.* Twentieth-century American Literature and Photography. Berlin : de Gruyter, 2015.

4. *Судленкова О. А.* Английская поэзия романтизма и современная проза : статьи разных лет. Минск : МГЛУ, 2015.

5. *Sabuchova A.* Šeptuchy. Bratislava : Artforum, 2019.